УДК 94 «1941/45» (476) (08) DOI 10.63874/2218-0281-2025-2-36-43

***Уладзімір Васільевіч Здановіч***
*д-р гіст. навук. праф., праф. каф. гісторыі Беларусі і паліталогіі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Vladimir Zdanovich***
*Doctor of Historical Sciences, Professor,*
*Professor of the Department of History of Belarus and Political Science*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: zvv2003@tut.by

# АДЛЮСТРАВАННЕ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ І САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ У ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ БССР У ВЕРАСНІ 1939 – ЧЭРВЕНІ 1941 Г. У ПАДРУЧНІКАХ ПА ГІСТОРЫІ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ ВНУ БЕЛАРУСІ

*Асветлены пытанні фарміравання прадстаўленняў аб падзеях у заходніх абласцях Беларусі на працягу верасня 1939 – чэрвеня 1941 г. у падручніках для вышэйшых навучальных устаноў БССР і Рэспубліцы Беларусь. Адзначаецца, што ў савецкі перыяд асаблівае значэнне надавалася кіруючай ролі камуністычнай партыі, якая забяспечыла паспяховае правядзенне сацыялістычных пераўтварэнняў. Асноўная ўвага была засяроджана на асвятленні толькі поспехаў і дасягненняў. У падручніках, выдадзеных у Рэспубліцы Беларусь, асабліва рэкамендаваных для студэнтаў гістарычных факультэтаў, знайшлі адлюстраванне разам са станоўчымі момантамі рэпрэсіі, забарона савецкай уладай усіх палітычных партый, акрамя камуністычнай, дэпартацыйная палітыка савецкага кіраўніцтва ў адносінах да насельніцтва тэрыторый заходніх абласцей Беларусі. Агульнай для падручнікаў, выдадзеных у БССР і Рэспубліцы Беларусь, з'яўляецца выснова, што ўключэнне Заходняй Беларусі ў склад СССР і БССР было гістарычна неабходным і апраўданым. Беларусь упершыню за ўсю гісторыю стала тэрытарыяльна цэласнай дзяржавай, у якой завяршыўся працэс тэрытарыяльнай і этнаграфічнай кансалідацыі беларускай нацыі.*
***Ключавыя словы:*** *падручнікі, дапаможнікі, БССР, Рэспубліка Беларусь, вышэйшыя навучальныя ўстановы, заходнія вобласці БССР, камуністычная партыя, сацыялістычныя пераўтварэнні, рэпрэсіі.*

## *Illustration of Social-Political, Economic and Socio-Cultural Transformations in the Western Regions of the BSSR in September 1939 – June 1941 in History Textbooks for Students of Universities of Belarus*

*The article highlights the issues of forming ideas about the events in the western regions of Belarus during September 1939 – June 1941 in textbooks for higher educational institutions of the BSSR and the Republic of Belarus. It is noted that during the Soviet period, special importance was attached to the leading role of the Communist Party, which ensured the successful implementation of socialist transformations. The main attention was focused on covering only successes and achievements. In the textbooks published in the Republic of Belarus, especially recommended for students of history faculties, along with positive moments, repressions, the ban by the Soviet government of all political parties, except the communist, and the deportation policy of the Soviet leadership in relation to the population of the territories of the western regions of Belarus were reflected. Common to textbooks published in the BSSR and the Republic of Belarus is the conclusion that the inclusion of Western Belarus into the USSR and the BSSR was historically necessary and justified. Belarus for the first time in history became a territorially integral state, in which the process of territorial and ethnographic consolidation of the Belarusian nation was completed.*
***Key words:*** *textbooks, manuals, BSSR, Republic of Belarus, higher educational institutions, western regions of BSSR, communist party, socialist transformations, repressions.*

**Уводзіны**

Далучэнне Заходняй Беларусі да БССР не толькі вызначыла будучыню беларускай дзяржавы, але і пакінула глыбокі след у жыцці кожнай сям'і заходніх абласцей Беларусі. Уступленне савецкіх войск на тэрыторыю Польшчы, далучэнне Заходняй Беларусі да БССР, грамадска-палітычныя, эканамічныя і сацыяльна-культурныя пераўтварэнні ў заходнебеларускім рэгіёне вызначаліся супярэчнасцямі, значнымі праблемамі. Дадзены перыяд па-рознаму ацэньваўся і ацэньваецца ў сучаснай айчыннай і замежнай навуцы. Па азначаных праблемах апублікавана значная колькасць манаграфій, раздзелаў у калектыўных выданнях, ар-

тыкулаў у зборніках і часопісах, энцыклапедычных выданнях. Шэраг ацэнак паўтараюцца ў падручніках, навучальных дапаможніках для вышэйшай школы. У сувязі з тым, што студэнты атрымліваюць інфармацыю па праблеме з разнастайных крыніц, асаблівая ўвага павінна надавацца зместу падручнікаў. Нягледзячы на тое, што падручнікі, навучальныя дапаможнікі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў з'яўляюцца асноўнай крыніцай для фарміравання ўяўленняў аб падзеях, якія адбываліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў верасні 1939 – чэрвені 1941 г., у беларускай гістарычнай навуцы адсутнічае гістарыяграфічны аналіз дадзенага віду гістарыяграфічных крыніц.

У прапанаваным артыкуле будзе праналізавана вучэбная літаратура для вышэйшых навучальных устаноў савецкага і беларускага перыядаў айчыннай гістарыяграфіі. Перад непасрэдным пачаткам аналізу трэба прыняць да ўвагі той факт, што падручнікі з'яўляюцца крыніцамі нарматыўнага характару, уяўляюць сабой спрошчаную апрацоўку матэрыялу, і ў сувязі з гэтым аўтары павінны скараціць вялікі аб'ём інфармацыі.

**Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Палітычныя, эканамічныя і сацыяльна-культурныя пераўтварэнні савецкай улады ў 1939–1941 гг. на старонках падручнікаў**

У савецкі перыяд асобнай беларускай гістарыяграфіі ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР не існавала. Яна была растворана ў агульнай гістарыяграфіі Савецкага Саюза. Вобразна кажучы, беларускія навукоўцы глядзелі на праблему вачыма маскоўскіх гісторыкаў.

У вышэйшых навучальных установах БССР дысцыпліна «Гісторыя Беларусі» існавала толькі на гістарычных факультэтах ВНУ. На іншых факультэтах навучальных установах рэспублікі, як, дарэчы, і саюзных рэспублік, выкладалася «Гісторыя КПСС». Так, у «Истории Коммунистической партии Советского Союза», выдадзенай у Маскве і рэкамендаваная ў якасці падручніка, праблеме ўз'яднання прысвечана некалькі радкоў у § 3 «Барацьба партыі і Савецкай дзяржавы за арганізацыю калектыўнага адпору фашысцкай агрэсіі ў 1939 г. Пачатак Другой сусветнай вайны»: «СССР не мог застацца абыякавым да лёсаў брацкага насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, не мог аддаць яго пад фашысцкае іга. 17 верасня 1939 г. Чырвоная армія перайшла мяжу, і ў кароткі тэрмін заняла Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь. Гэтыя вобласці ўз'ядналіся з Савецкай Украінай і Савецкай Беларуссю ў адзіныя дзяржавы ўкраінскага і беларускага народаў» [1, с. 432].

У беларускіх выкладчыкаў гісторыі КПСС большай папулярнасцю карыстаўся «Курс лекций по истории КПСС», падрыхтаваны айчыннымі гісторыкамі пад агульнай рэдакцыяй У. М. Сікорскага. Аднак падыходы беларускіх даследчыкаў канцэптуальна не адрозніваліся ад іх расійскіх калег. Адзіным дапаўненнем сталі наступныя радкі: «Уз'яднанне ўкраінскага і беларускага народаў у адзінай Савецкай сацыялістычнай дзяржаве было ажыццёўлена пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і вынікам сусветна-гістарычных перамог сацыялізму, пераўтварыўшых Савецкі Саюз у магутную дзяржаву. Усталяванне Савецкай улады ў заходніх абласцях УССР і БССР з'явілася пачаткам новай, сацыялістычнай эры ў іх гісторыі» [2, с. 152].

На гістарычных факультэтах разам з «Гісторыяй КПСС», як ужо адзначалася, выкладалася «Гісторыя Беларусі». Аднак спецыяльнага падручніка не існавала. Гісторыя Беларусі ў асноўным разглядалася ў курсе «Гісторыя СССР». У якасці дапаможніка прапаўноўваліся выдадзеная ў 1961 г. «История Белорусской СССР» (першае выданне ўбачыла свет у 1954 г.) і 5-томная «Гісторыя Беларускай ССР». Нягледзячы на рознасць дысцыплін, якія выкладаліся на гістарычных і неспецыяльных факультэтах, ацэнкі падзей верасня 1939 – чэрвеня 1941 г. істотна не адрозніваліся.

Так, у другім томе дапоўненай «Истории Белорусской ССР» адзначалася: «Савецкі Саюз не мог застацца абыякавым да лёсаў брацкага насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, ён павінен быў узяць іх пад абарону… 17 верасня 1939 г. на досвітку часці Украінскага і Беларускага франтоў перайшлі савецка-польскую мяжу. Чырвоная Армія пачала свой вызваленчы паход… Працоўныя заходніх абласцей Беларусі, адарваныя на працягу 20 гадоў ад сваёй Радзімы – Савецкага Саюза, вярнуліся ў братнюю сям'ю савецкіх народаў.

Беларускі народ быў канчаткова ўз'яднаны ў адзінай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай дзяржаве» [3, с. 383, 387].

Значна больш увагі разглядаемым падзеям нададзена ў 5-томнай «Гісторыі Беларускай ССР». У 4-м томе ў раздзеле 3 «Уз'яднанне беларускага народа ў адзінай савецкай дзяржаве» ёсць § 4 «Вызваленне Заходняй Беларусі» і § 5 «Першыя сацыялістычныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях БССР». Так, у § 4 на с. 86 пазначана: «Раніцай 17 верасня часці Чырвонай Арміі пачалі свой вызваленчы паход у Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. Рашэнне савецкага ўрада было падтрымана ўсім савецкім народам… Насельніцтва Заходняй Беларусі сустракала савецкіх воінаў як родных братоў: з кветкамі, хлебам-соллю. Усюды ў гарадах і вёсках ўзнікалі мнагалюдныя мітынгі, на якіх працоўныя горача віталі сваіх вызваліцеляў». Істотным адрозненнем ад папярэдніх выданняў з'яўляецца тое, што аўтары, хоць і ў сціслай форме, паказваюць і негатыўныя моманты палітыкі «саветызацыі», якая праводзілася ў рэгіёне (так называецца ў гісторыі перыяд сацыялістычных пераўтварэнняў у рэгіёне). Характарызуючы мерапрыемствы савецкай улады ў сельскай гаспадарцы, аўтары падкрэсліваюць: «Як і ва ўсходніх абласцях БССР і іншых рэспубліках, у аснову сваёй класавай палітыкі ў заходнебеларускай вёсцы Камуністычная партыя паклала лозунг: "Апора на бедняка і саюз з серадняком пры бязлітаснай барацьбе з кулацтвам"» [4, с. 104]. У дачыненні да кулакоў, у першую чаргу да асаднікаў, прымяняліся і радыкальныя меры. «Паколькі асаднікі маглі стаць апорай для ўзброенага бандытызму, – адзначаюць аўтары, – да іх былі ўжыты рэпрэсіўныя меры. Ахоўнікі і работнікі лясной аховы ў канцы 1939 г. былі выселены за межы рэспублікі» [4, с. 105].

Не абышлі ўвагай гісторыкі і пераўтварэнні ў іншых галінах народнай гаспадаркі. «З лістапада 1939 г. да сярэдзіны 1940-х гг. у заходніх абласцях БССР адбыліся першыя сацыялістычныя пераўтварэнні… Была ўстаноўлена сістэма народнай асветы, праведзены пераўтварэнні ў іншых галінах культуры. Склалася новая сістэма грамадска-палітычнага жыцця» [4, с. 114].

У беларускі перыяд склаліся спрыяльныя ўмовы для якасна новых змяненняў у гістарычнай навуцы. Распрацавана нацыянальная канцэпцыя гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Беларусі, вызначаны інстытуцыйныя і метадалагічныя парадыгмы ў беларускай гістарычнай навуцы, адзначаны станоўчыя тэндэнцыі росту кадравага патэнцыялу вучоных-гісторыкаў.

Новыя падыходы да праблемы канцэптуальна акрэслены ў другой частцы «Нарысаў гісторыі Беларусі», якія рэкамендавалася студэнтам, у першую чаргу гістарычных факультэтаў, у якасці дапаможніка. У выданні знайшлі адлюстраванне нароўні са станоўчымі момантамі рэпрэсіі, забарона савецкай уладай усіх палітычных партый, акрамя камуністычнай, рэарганізацыя прафсаюзаў па савецкай мадэлі, стварэнне камсамольскіх арганізацый. На с. 240 адзначана, што «далейшае правядзенне сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у заходніх абласцях БССР ускладнялася грубымі парушэннямі законнасці, асабліва рэпрэсіямі, якія праводзіліся карнымі органамі… Усяго разам з сем'ямі пацярпелі ад рэпрэсій больш за 100 тыс. чалавек» [5, с. 240].

У 2001 г. пад рэдакцыяй прафесараў Я. К. Новіка і Г. С. Марцуля ў якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў убачыла свет другая частка «Гісторыі Беларусі». У главе 1 «Перадваенны крызіс і пачатак Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Далучэнне Віленшчыны да Літвы», падтрымліваючы высновы савецкай гістарыяграфіі аб тым, што «працоўныя Заходняй Беларусі з радасцю і надзеяй сустракалі Чырвоную Армію» [6, с. 221], літаральна некалькі радкоў прысвяцілі і негатыўным момантам: «Пры правядзенні сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, устанаўлення савецкай сістэмы кіравання грамадствам не абышлося і без парушэнняў закона новымі ўладамі – рэпрэсій і дэпартацый (высялення памешчыкаў, капіталістаў, паліцэйскіх, дзяржаўных служачых, гандляроў, кулакоў і інш.)» [6, с. 223]. Па сутнасці, ацэнка дэпартацый не адрозніваецца ад ацэнкі аўтараў 5-томнай «Гісторыі Беларускай ССР». Адзначым, што ў 2007 г. вучэбны дапаможнік набыў статус падручніка і потым некалькі разоў (са зменай аўтараў у некаторых выпадках) перавыдаваўся [7].

Іншыя падыходы да асвятлення вераснёўскіх падзей 1939 г. і наступных мерапрыемстваў савецкай улады закладзены ў выдадзенай у 2006 г. кнізе І. А. Саракавіка «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі», якая, як пазначана ў кароткай анатацыі, разлічана на студэнтаў, але не рэкамендавана Міністэрствам адукацыі ў якасці падручніка ці дапаможніка [8]. Дадзеныя аспекты разгледжаны ў раздзеле 11 у § 1 «Пачатак Другой сусветнай вайны. Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад СССР і БССР». Як вынікае з назвы, тэрмін «уз’яднанне» заменены тэрмінам «уключэнне». Адзначым, што савецкай гістарыяграфіі і большасці сучасных выданняў уласцівы тэрмін «уз’яднанне», замацаваны яшчэ ў 1949 г. пастановай ЦК КП(б)Б ад 5 верасня «Уз’яднанне беларускага народа ў адзінай беларускай савецкай дзяржаве». Праўда, у тэксце ўжываецца і тэрмін «уз’яднанне».

Пры далейшым знаёмстве з тэкстам высвятляецца, што колькасць адрозненняў павялічваецца. На с. 315 чытаем: «Заняўшы Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну, СССР тым самым парушыў у аднабаковым парадку Рыжскі мірны дагавор 1921 г. і дагавор з Польшчай, заключаны ў 1939 г.». Але «ў той жа час уз’яднанне беларускага народа ў адну сям’ю з’явілася гістарычна справядлівым актам, мела для яго пазітыўнае значэнне» [8, с. 313].

Адзначыўшы, што «ў спешным парадку праводзіліся сацыялізацыя прамысловасці, сельскай гаспадаркі, адукацыі, культуры, выхавання і іншых сфер жыццядзейнасці» [8 с. 319], аўтар засяродзіўся на кадравай палітыцы савецкай улады і рэпрэсіях. «На працу ў заходнія раёны Беларусі, – адзначае І. А. Саракавік, – былі накіраваны тысячы партыйных, савецкіх, камсамольскіх работнікаў, спецыялістаў народнай гаспадаркі. Яны ўзначалілі мясцовыя органы ўлады і кіравання, хоць і не ведалі мясцовай спецыфікі, і адразу ж пачалі барацьбу з “ворагамі” савецкай улады – асаднікамі, жаўнерамі, паліцэйскімі, дзеячамі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху… У цэлым рэпрэсіям было падвергнута прыкладна 10 % насельніцтва Заходняй Беларусі. 50 % рэпрэсіраваных былі палякамі, 20 % – беларусамі, 30 % – яўрэямі». Звярнуў увагу гісторык і на перасяленні. Згодна з дадзенымі І. А. Саракавіка, «толькі са снежня 1939 г. па студзень 1940 г. у бок Германіі праз Брэст прайшлі 5335 немцаў, 108 палякаў, 10 украінцаў, 8 рускіх, 1 чэх. У Беларусь трапіла 10 420 ваеннапалонных радавога і малодшага каманднага складу былой польскай арміі, большасць з якіх былі ўраджэнцамі мясцовых зямель» [8, с. 318, 319].

Асобны падраздзел, прысвечаны восеньскім падзеям 1939 г. на тэрыторыі Беларусі, ёсць у вучэбным дапаможніку «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)». Падкрэсліваючы, што ўз’яднанне штучна падзеленага беларускага народа стала актам гістарычнай справядлівасці, аўтары адначасова паказваюць і складанасць сітуацыі, якая прымушала ўлады выкарыстоўваць і рэпрэсіўныя меры: «Некаторыя пераўтварэнні ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы выклікалі незадаволенасць у часткі польскага насельніцтва. Асабліва рэзкія выступленні былі з боку кулакоў, былых ляснічых, асаднікаў і паліцэйскіх. Варта заўважыць, што пры актыўнай падтрымцы польскага эміграцыйнага ўрада і касцёла на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі была створана даволі шырокая канспіратыўная сетка польскага нацыяналістычнага падполля, якое вяло барацьбу за захаванне Польшчы ў межах да верасня 1939 г. Маючы пэўную падтрымку сярод мясцовага польскага насельніцтва, нелегальныя арганізацыі былі заснаваны і дзейнічалі ў большасці буйных населеных пунктаў. Органы бяспекі правялі шэраг аперацый па разгроме канспіратыўнай сеткі. Толькі з кастрычніка 1939 г. па ліпень 1940 г. было раскрыта 109 падпольных арганізацый, якія аб’ядноўвалі 3231 удзельніка, з якіх 2904 чалавекі былі польскай нацыянальнасці. У мэтах папярэджання шырокай хвалі антысавецкіх выступленняў органы бяспекі ажыццяўлялі рэпрэсіўныя мерапрыемствы. Тых, хто ўдзельнічаў у антысавецкіх актах, а таксама бежанцаў з Заходняй Беларусі, якія не жадалі прымаць у БССР савецкае грамадзянства, высялялі ва ўсходнія і паўночныя раёны Савецкага Саюза» [9, с. 56].

Цікава паглядзець, як падаваўся матэрыял, прысвечаны гэтай праблеме, у дапаможніках і падручніках для студэнтаў гістарычных факультэтаў. Для прыкладу возь-

мем выданне «Гісторыя Беларусі. У 2 частках. Ч. 2. XIX–XX стст. Курс лекцый», падрыхтаванае выкладчыкамі БДУ. Падзеі верасня 1939 – чэрвеня 1941 г. разгледжаны ў тэме 7 «Беларусь у перыяд Другой сусветнай вайны» ў лекцыі 22 «Першы этап вайны». Ужо ў пачатку лекцыі гаворыцца аб тым, што «лёс беларускага народа быў цесна звязаны з падзеямі Другой Сусветнай вайны, якая пачалася з нападу Германіі на Польшчу 1 верасня 1939 г. Менавіта ў гэты час адбылося ўз'яднанне беларускага народа ў адзінай нацыянальнай дзяржаве… Ва ўмовах, калі амаль усе жыццёва важныя цэнтры Польшчы былі заняты нямецкімі войскамі (14 верасня быў акружаны г. Брэст, а 15 верасня паў Беласток і пад пагрозай захопу апынуўся Львоў), былі апублікаваны пастановы ваенных саветаў Беларускага і Украінскага франтоў. У іх ставілася задача "пакласці канец прыгнёту працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, прадаставіць поўную бяспеку працоўным гэтых абласцей". Раніцай 17 верасня войскі Чырвонай Арміі перайшлі савецка-польскую мяжу» [10, с. 439, 440].

Не пакінулі без увагі гісторыкі і падпісаныя 23 жніўня 1939 г. паміж Германіяй і Савецкім Саюзам дагавор аб ненападзе і сакрэтны пратакол аб падзеле сфер уплыву, а таксама дагавор аб дружбе і мяжы паміж СССР і Германіяй ад 28 верасня 1939 г. «У канчатковым варыянце савецка-германскіх перамоў, – адзначаюць аўтары, – да заходнебеларускіх этнічных зямель былі далучаны заходнія паветы Беластоцкага ваяводства з пераважна польскім насельніцтвам (без Сувалкаўскага павета і большай часткі Аўгустоўскага), а таксама поўнасцю Ломжынскі павет, усходнія часткі Астралэнцкага і Востраў-Мазавецкага паветаў Варшаўскага ваяводства. Большасць сялян, рабочых, рамеснікаў, інтэлігенцыі Заходняй Беларусі сустракалі Чырвоную Армію як вызваліцельніцу» [10, с. 442].

Пры характарыстыцы першых пераўтварэнняў савецкай улады ўвага была нададзена і кадравай палітыцы: «20 верасня арганізацыйна-інструктарскі аддзел ЦК склаў спісы работнікаў для часовых упраўленняў, былі падабраны кандыдатуры на кіруючыя партыйныя і савецкія пасады. Усяго да кастрычніка 1940 г. на працу ў Беластоцкую вобласць было накіравана 12 396 чалавек, Брэсцкую – 5989» [10, с. 443].

Прызнаючы поспехі палітыкі «саветызацыі», дзякуючы якой Беларусь дасягнула значных поспехаў у развіцці народнай гаспадаркі, культуры і адукацыі, ператварылася з аграрнай у індустрыяльна-аграрную краіну, аўтары падкрэсліваюць: «Разам са станоўчымі момантамі ў жыцці жыхароў краю паявіліся некаторыя праблемы. У шэрагу выпадкаў накіраваныя на працу ў Заходнюю Беларусь работнікі ігнаравалі мясцовы лад жыцця, традыцыі насельніцтва. Здаралася неабаснаванае адхіленне ад працы спецыялістаў польскай нацыянальнасці, прымусовая рэарганізацыя польскіх школ у беларускія ці рускія, ігнараванне патрэб гаспадарак аднаасобнікаў. Адмоўна была ўспрынята жыхарамі Заходняй Беларусі перадача Сталіным Літве 10 кастрычніка 1939 г. Вільні і вобласці (Віленска-Трокскі, частка тэрыторыі Свянцянскага і Браслаўскага паветаў) агульнай плошчай 6900 км$^2$… Вялікай памылкай з'явілася нацыяналізацыя аб'ектаў гандлю, дробных прадпрыемстваў. Гэта прывяло да дэфіцыту тавараў шырокага спажывання, росту цэн на іх… Напружанасць у грамадстве выклікалі арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях рэспублікі. Яшчэ ў канцы верасня 1939 г. былі арыштаваны вядомыя беларускія нацыянальныя дзеячы: А. Луцкевіч, В. Багдановіч, У. Самойла, Ян Пазняк, М. Касцевіч і інш., якія не прымалі сацыялістычнай ідэі, але актыўна ўдзельнічалі ў вызваленчым руху. Згодна з рашэннем кіраўніка НКУС СССР Л. Берыі ад 5 снежня з заходніх абласцей Беларусі высяленню падлягалі работнікі лясной аховы і ваенныя асаднікі. 3 лютага 1940 г. па 20 чэрвеня 1941 г. было рэпрэсіравана больш як 125 тыс. чалавек. Сярод дэпарціраваных былі не толькі асаднікі, работнікі лясной аховы, члены іх сямей, але арыштаваныя раней паліцэйскія, жандармы, фабрыканты, памешчыкі і асобы, якія падазраваліся ў прыналежнасці да антысавецкіх арганізацый» [10, с. 446, 449, 450].

Нельга не адзначыць паказ аўтарамі ваенна-палітычнага становішча на тэрыторыі Беларусі ў 1939–1941 гг. і дзейнасці польскага падполля, якое «імкнулася адрадзіць польскую дзяржаву ў даваенных межах. Самай уплывовай падпольнай арганізацыяй быў «Саюз узброенай барацьбы».

Сумесна з арганізацыямі «Саюз польскіх патрыётаў», «Стральцы», «Сокал», «Вызваленцы», «Партызанка» яны вялі антысавецкую прапаганду, стваралі тайныя арсеналы зброі, праводзілі асобныя тэрарыстычныя акты супраць ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, супрацоўнікаў НКУС і актывістаў савецкіх устаноў» [10, с. 450].

Інфармацыя, змешчаная ў дапаможніках для студэнтаў неспецыяльных факультэтаў, па аб’ёму, зместу істотна адрозніваецца ад інфармацыі ў падручніках і дапаможніках для студэнтаў-гісторыкаў. Для параўнання возьмем навучальны дапаможнік А. І. Котава «Гісторыя Беларусі і сусветная цывілізацыя. Навучальны дапаможнік для студэнтаў прыродазнаўчых факультэтаў». Разглядаемай падзеі прысвечаны наступныя радкі: «Германскія войскі імкліва рухаліся да граніц СССР, і 17 верасня 1939 г. савецкі ўрад аддаў загад Чырвонай Арміі перайсці граніцу з Польшчай і ўзяць пад абарону насельніцтва Заходняй Беларусі. К 25 верасня савецкія войскі поўнасцю занялі тэрыторыю Заходняй Беларусі. У кастрычніку 1939 г. адбыліся выбары ў Народны сход Заходняй Беларусі, які прыняў рашэнне аб уваходжанні яе ў склад БССР. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР было актам гістарычнай справядлівасці. Яно аднавіла парушанную Рыжскім дагаворам (1921 г.) тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі і ўз’яднала беларускі народ у адну сям’ю» [11, с. 105].

Разам з тым у некаторых дапаможніках для студэнтаў няпрофільных факультэтаў побач з паказам несумненных поспехаў савецкай улады ў правядзенні пераўтварэнняў у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, сацыяльнай сферы, адукацыі, культуры знайшлі адлюстраванне і недахопы, і нават негатыўныя моманты. Прыкладам такога падыходу можа служыць дапаможнік «История Беларуси в контексте европейской цивилизации», падрыхтаваны на рускай мове выкладчыкамі гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна і рэкамендаваны вучэбна-метадычным аб’яднаннем па гуманітарнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для замежных студэнтаў усіх спецыяльнасцей устаноў вышэйшай адукацыі.

«У грамадска-палітычным жыцці Беларусі, – адзначаюць аўтары, – праявіліся адмоўныя бакі адміністрацыйна-каманднай і рэпрэсіўнай сістэмы. 30 верасня 1939 г. былі арыштаваны, а затым рэпрэсіраваны беларускія дзеячы нацыянальна-вызваленчага руху. Згодна з прынятай у снежні 1939 г. сакрэтнай пастановай СНК СССР “Аб высяленні асаднікаў і работнікаў лясной аховы з заходніх абласцей БССР”, былі дэпартаваны ў Сібір, Казахстан і іншыя месцы 120 тыс. чалавек. Гэта адмоўна адбілася на маральна-псіхалагічнай атмасферы краіны» [12, с. 87].

З 2022 г. у ВНУ Беларусі на неспецыяльных факультэтах замест курса «Гісторыя Беларусі» быў ўведзены курс «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», які, дарэчы, выкладаецца і на гістарычных факультэтах. У тым жа годзе пад рэдакцыяй І. А. Марзалюка быў выдадзены адпаведны вучэбны дапаможнік. Праблема ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР раскрываецца ў тэме 1.6 «Вялікая Айчынная вайна – ключавая падзея навейшай гісторыі» ў падраздзеле «Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР». Характарызуючы дадзены працэс, аўтары адзначаюць, што, «імкнучыся выйграць час для падрыхтоўкі краіны да вайны, 23 жніўня 1939 г. Вячаслаў Молатаў ад імя СССР падпісаў у Маскве Дагавор аб ненападзе паміж СССР і Германіяй, а таксама дадатковы пратакол да яго. Разумеючы супярэчлівасць гэтых працэсаў, неабходна пазначыць: менавіта гэтыя дакументы стварылі знешнепалітычныя ўмовы для ўз’яднання беларусаў, якія супольна разам з палякамі змагаліся супраць нацысцкай Германіі… Наркам замежных спраў СССР В. Молатаў 17 верасня 1939 г. уручыў польскаму паслу ў Маскве ноту, у якой паведамлялася, што савецкі ўрад аддаў загад Чырвонай Арміі перайсці мяжу з Польшчай. Да 25 верасня 1939 г. тэрыторыя Заходняй Беларусі была цалкам занятая Чырвонай Арміяй» [13, с. 164, 165].

Раскрываючы сацыялістычныя пераўтварэнні ў народнай гаспадарцы, культуры, адукацыі, гісторыкі асноўную ўвагу засяродзілі на станоўчых аспектах праводзімай палітыкі.

**Заключэнне**

Праведзены гістарыяграфічны аналіз сведчыць аб тым, што розныя аспекты

палітычных, эканамічных і сацыяльна-культурных пераўтварэнняў савецкай улады ў заходнебеларускім рэгіёне ў верасні 1939 – чэрвені 1941 г. знайшлі адлюстраванне на старонках падручнікаў і навучальных дапаможнікаў для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў. У савецкі перыяд асаблівае значэнне надавалася кіруючай ролі камуністычнай партыі, якая забяспечыла паспяховае правядзенне сацыялістычных пераўтварэнняў. Асноўная ўвага была засяроджана на асвятленні толькі поспехаў і дасягненняў.

У падручніках, выдадзеных у Рэспубліцы Беларусь, асабліва рэкамендаваных для студэнтаў гістарычных факультэтаў, знайшлі адлюстраванне разам са станоўчымі момантамі рэпрэсіі, забарона савецкай уладай усіх палітычных партый, акрамя камуністычнай, дэпартацыйная палітыка савецкага кіраўніцтва ў адносінах да насельніцтва тэрыторый заходніх абласцей Беларусі.

Агульнай для падручнікаў і дапаможнікаў, выдадзеных у БССР і Рэспубліцы Беларусь, з'яўляецца выснова аб тым, што ўключэнне Заходняй Беларусі ў склад СССР і БССР было гістарычна неабходным і апраўданым. Беларусь упершыню за ўсю гісторыю стала тэрытарыяльна цэласнай дзяржавай, у якой завяршыўся працэс тэрытарыяльнай і этнаграфічнай кансалідацыі беларускай нацыі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. История Коммунистической партии Советского Союза / редкол.: И. Н. Поспелов (гл. ред.) [и др.] – 7-е изд., доп. – М. : Политиздат, 1985. – 783 с.
2. Курс лекций по истории КПСС. Ч. 1. (1883–1925 гг.) / под ред. В. М. Сикорского. – Изд. 2-е, доп. и испр. – Минск : Изд-во БГУ, 1975. – 608 с.
3. История Белорусской ССР : в 2 т. / под ред. Л. С. Абецедарского [и др.]. – Минск : Акад. наук Белорус. ССР, 1961. – Т. 2. – 703 с.
4. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі ; рэдкал.: І. М. Ігнаценка (старш.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 4 : Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.) / рэдкал.: І. С. Краўчанка [і інш.]. – 1975. – 640 с.
5. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994–1995. – Ч. 2. – 1995. – 560 с.
6. Гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. : у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка і Г. М. Марцуля. – Ч. 2 : Люты 1917 – 2001 гг. – Мінск : Універсітэцкае, 2001. – 464 с.
7. Гісторыя Беларусі : падручнік для ВНУ : у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка і Г. М. Марцуля. – Ч. 2 : Люты 1917 – 2001 гг. – Мінск : Выш. шк., 2007. – 445 с.
8. Саракавік, І. А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І. А. Саракавік. – Мінск : Соврем. шк., 2006. – 456 с.
9. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны) : вучэб. дапам. / А. А. Каваленя [і інш.] ; пад рэд. акад. НАН Беларусі А. А. Каваленi. – Мінск : РІВШ, 2022. – 278 с.
10. Гісторыя Беларусі : курс лекцый : у 2 ч. / П. Брыгадзін, У. Ладысеў, П. Зялінскі [і інш.]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2002. – Ч. 2 : XIX–XX стст. – 656 с.
11. Котаў, А. І. Гісторыя Беларусі і сусветная цывілізацыя : навуч. дапам. для студэнтаў прыродазн. фак. – 2-е выд. – Мінск : БДУ, 2003. – 161 с.
12. Галимова, Н. П. История Беларуси в контексте европейской цивилизации : учеб.-метод. пособие для иностр. студентов / Н. П. Галимова, Т. П. Савчук, Р. В. Чуль ; Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина. – Брест : БрГУ, 2018. – 164 с.
13. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў выш. адукацыі / І. А. Марзалюк [і інш.] ; пад агул. рэд. І. А. Марзалюка. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.


## REFERENCES


1. Istoriya Kommunisticheskoi partii Sovetskogo Soyuza. / redkol.: I. N. Pospelov (gl. red.) [i dr.]. – 7-e izd., dop. – M. : Politizdat, 1985. – 783 s.

2. Kurs lektsii po istorii KPSS. Ch. 1. (1883–1925 gg.) / pod red. V. M. Sikorskogo. – Izd. 2-e, dop. i ispr. – Minsk : Izd-vo BGU, 1975. – 608 s.

3. Istoriya Belorusskoi SSSR : v 2 t. / pod red. L. S. Abetsedarskogo [i dr.]. – Minsk : Akad. nauk Belorus. SSR, 1961. – T. 2. – 703 s.

4. Gistoryya Belaruskai SSR : u 5 t. / Akad. navuk BSSR, In-t gistoryi ; redkal.: I. M. Ignatsenka (starsh.) [i insh.]. – Minsk : Navuka i tehknika, 1972–1975. – T. 4 : Belarus' napyaredadni i u gady Vyalikai Aichynnai vainy Savetskaga Sayuza (1938–1945 gg.) / redkal.: I. S. Krauchanka [i insh.]. – 1975. – 640 s.

5. Narysy gistoryi Belarusi : u 2 ch. / M. P. Kastsyuk [i insh.]. – Minsk : Belarus', 1994–1995. – Ch. 2. – 1995. – 560 s.

6. Gistoryya Belarusi : vucheb. dapam. : u 2 ch. / pad red. Ya. K. Novika i G. M. Martsulya. – Ch. 2 : Lyuty 1917 – 2001 gg. – Minsk : Universitehtskae, 2001. – 464 s.

7. Gistoryya Belarusi : padruchnik dlya VNU : u 2 ch. / pad red. Ya. K. Novika i G. M. Martsulya. – Ch. 2 : Lyuty 1917 – 2001 gg. – Minsk : Vysh. shk., 2007. – 445 s.

8. Sarakavik, I. A. Gistoryya Belarusi u kantekstse susvetnai gistoryi / I. A. Sarakavik. – Minsk : Sovrem. shk., 2006. – 456 s.

9. Vyalikaya Aichynnaya vaina savetskaga naroda (u kantehkstse Drugoi susvetnai vainy) : vucheb. dapam. / A. A. Kavalenya [i insh.] ; pad red. akad. NAN Belarusi A. A. Kavaleni. – Minsk : RIVSh, 2022. – 278 s.

10. Gistoryya Belarusi : kurs lektsyi : u 2 ch. / P. Brygadzin, U. Ladyseu, P. Zyalinski [i insh.]. – Minsk : RIVSh BDU, 2002. – Ch. 2 : XIX–XX stst. – 656 s.

11. Kotau, A. I. Gistoryya Belarusi i susvetnaya tsyvilizatsyya : navuch. dapam. dlya studentau pryrodazn. fak. – 2-e vyd. – Minsk : BDU, 2003. – 161 s.

12. Galimova, N. P. Istoriya Belarusi v kontekste evropeiskoi tsivilizatsii : ucheb.-metod. posobie dlya inostr. studentov / N. P. Galimova, T. P. Savchuk, R. V. Chul' ; Brest. gos. un-t im. A. S. Pushkina. – Brest : BrGU, 2018. – 164 s.

13. Gistoryya belaruskai dzyarzhaunastsi : vucheb. dapam. dlya studentau ustanou vysh. adukatsyi / I. A. Marzalyuk [i insh.] ; pad agul. red. I. A. Marzalyuka. – Minsk : Adukatsyya i vykhavanne, 2022. – 447 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 11.09.2025*